■ Дэкрэт №3

# УМОВЫ ПАВІННЫ БЫЦЬ АДНОЛЬКАВЫЯ

## Сяргей Раўнейка прапануе зрабіць папраўкі ў заканадаўстве для ваеннаслужачых тэрміновай службы і студэнтаў-платнікаў

**Гэтую думку памочнік Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь — галоўны інспектар па Гродзенскай вобласці выказаў у Ваўкавыску падчас прыёму грамадзян па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства».**



Фота БЕЛТА.

Усяго на прыём прыйшлі 20 жыхароў Ваўкавыска і Ваўкавыскага раёна. Большасць з іх — гэта грамадзяне, якія трапілі ў спісы так званых утрыманцаў. Кожны — са сваёй гісторыяй. Кожны разлічвае на разуменне з боку ўладаў.

Ала Іванаўна не можа пагадзіцца з тым, што ў гэтыя спісы трапіў яе малодшы сын, які цяпер служыць у арміі. Да гэтага ён атрымаў дзве адукацыі, у тым ліку па спецыяльнасці заатэхнік. Але ўладкавацца на работу не змог. У выніку павінен заплаціць збор на фінансаванне дзяржаўных расходаў. Але Іванаўне паабяцалі паспрыяць вызваленню яе сына ад неабходнасці выплачваць гэтыя грошы, а самому маладому чалавеку параілі пасля заканчэння службы звярнуцца ў райвыканкам для далейшага працаўладкавання.

— Нам патрэбны кадры, тым больш спецыялісты ў галіне сельскай гаспадаркі, — зазначыў Сяргей Раўнейка, — мы імі раскідвацца не будзем. Разам з тым павінны быць рэгламентаваны ўсе выпадкі, каб было менш прэтэнзій, і мы гэты вопыт напрацоўваем. Пазней з'явяцца розныя акты, палажэнні, але і зараз у грамадзян ёсць права падаць апеляцыю, згодна са змяненнямі, якія ўнесены ў Дэкрэт №3.

Арцём па адукацыі юрыст, але за папярэдні перыяд працаваў на некалькі дзён менш, чым устаноўлена Дэкрэтам, — да 183 дзён не хапіла ўсяго двух. Патлумачыў, што цяжка знайсці работу па спецыяльнасці. Зараз ён уладкаваўся юрысконсультам у райбальніцу. З аналагічнай праблемай звярнулася і эканаміст Хрысціна, якая зараз працуе на адным з буйных прадпрыемстваў Ваўкавыска. Падчас прыёму Арцёму і Хрысціне было прапанавана напісаць заяву з просьбай аб вызваленні ад выплаты збору. Разам з тым Сяргей Раўнейка адзначыў, што на рынку працы зашмат юрыстаў і эканамістаў, цяпер больш патрэбны тэхнічныя спецыяльнасці. Гэта варта ўлічваць пры выбары будучай прафесіі, каб не было праблем з працаўладкаваннем. У гэтым кірунку патрэбна змяніць і адукацыйныя праграмы.

Некалькі жыхароў раёна і райцэнтра, якія прыйшлі на прыём, патлумачылі сваю сітуацыю станам здароўя. У іх ліку і Людміла Іосіфаўна, якая пражывае ў Свіслачы, але набыла дом у Ваўкавыску. Цяпер жанчына ўладкавалася качагарам, разам з мужам трымаюць гаспадарку. На стан здароўя паскардзіўся і малады жыхар Ваўкавыска, які прыйшоў на прыём разам з маці. Ён паведаміў, што некаторы час працаваў на СТА ў Мінску, але звольніўся з-за хваробы і больш за два гады нідзе не працуе. За гэты час хлопец нават на ўлік у службу занятасці не стаў, да таго ж не атрымаў ніякай спецыяльнасці.

— Плаціць падаткі трэба, інакш мы не зможам утрымліваць нашу сацыяльную сферу, у тым ліку ахову здароўя, якой вы таксама карысталіся, — адказаў гэтым людзям Сяргей Раўнейка. — Думаю, што цяжкасцям можна супрацьпаставіць сваю сілу волі, а з боку дзяржавы будзе падтрымка, каб жыццё палепшылася.

Падчас прыёму спецыялісты райвыканкама ўдакладнілі, што ў цэнтры занятасці ёсць магчымасць набыць спецыяльнасці, якія патрэбны на рынку працы, гэта сталяр, станочнік, цясляр, для жанчын — кухар, кулінар, швачка. На гэтыя прафесіі ёсць попыт, ёсць гарантыі ад наймальнікаў. Да таго ж новыя рабочыя месцы з'явяцца на прадпрыемствах, якія зараз будуюцца.

Разам з тым у ходзе прыёму грамадзян узніклі пытанні, якія патрабуюць удасканальвання заканадаўства. У прыватнасці, склаліся неаднолькавыя ўмовы для маладых спецыялістаў, якія скончылі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Так, дыпломы студэнтам-платнікам выдаюцца 30 чэрвеня, і калі спецыяліст не паспеў уладкавацца на работу з 1 ліпеня 2015 года па 1 студзеня 2016 года, то ўжо падпадае пад дзеянне Дэкрэта №3. У той жа час выпускнікоў бюджэтнай формы навучання гэта не закранае, бо іх працоўны адлік пачынаецца з 1 жніўня.

— Правы на першае працоўнае месца ў нас гарантавана выпускнікам абедзвюх формаў навучання — і бюджэтнай, і платнай, — падкрэсліў Сяргей Раўнейка. — А канікулярны водпуск — гэта працяг вучобы, і павінен быць аднолькавы для ўсіх. У гэтай справе павінны быць змяненні.

Неабароненымі аказаліся і ваеннаслужачыя тэрміновай службы. Закон не замацоўвае за імі права вярнуцца на тое месца работы, адкуль яны пайшлі ў армію. З такімі выпадкамі не аднойчы сутыкалася раённае аб'яднанне прафсаюзаў, паведаміў яго старшыня Віктар Паўловіч. У той жа час за жанчынамі, якія знаходзяцца ў дэкрэтным адпачынку, іх працоўнае месца застаецца. Але абедзве сітуацыі падобныя, бо і дэкрэт, і армія не залічваюцца ў працоўны стаж. Старшыня раённага прафсаюза лічыць, што гэта — адыход ад сацыяльных гарантый.

Сяргей Раўнейка паведаміў, што такія пытанні абмяркоўваюцца, ужо падрыхтаваны адпаведныя змяненні. Кожнаму, хто прыйшоў на прыём, была дадзена парада звярнуцца з заявай у райвыканкам, дзе будуць улічвацца жыццёвыя абставіны: мясцовым органам улады цяпер нададзена права вызваляць ад выплаты збору на фінансаванне дзяржаўных расходаў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
*margo@zviazda.by*

■

# Дык ці была платная працэдура?

«ГАРАЧЫ» 287 17 41

**Са Смалявіч патэлефанаваў заяўнік Віктар Н. з пытаннямі, якія датычылі медыцынскага абслугоўвання.**

— Нядаўна хацеў здаць кроў з вены на біяхімію ў паліклініцы, дык сказалі, што бясплатна гэта можна зрабіць толькі адзін раз на год. А паколькі я апошні раз здаваў кроў летась у красавіку, адпаведна, год яшчэ не прайшоў. Выходзіць, мне трэба рабіць працэдуру платна? Але раней, яшчэ зусім нядаўна, усе біяхімічныя аналізы былі бясплатнымі. Што за новаўвядзенне? Ці маюць яны на гэта права? — сфармуляваў грамадзянін свае пытанні.

Даць больш падрабязныя тлумачэнні наконт сітуацыі, што быццам бы ўзнікла ў заяўніка ў паліклініцы, ён адмовіўся. Гэтак жа, як і расказаць больш грунтоўна пра сябе. У такіх выпадках немагчыма даць дакладны адказ на агульнае пытанне, не ведаючы ўсіх акалічнасцяў справы.

Гэта нам пацвердзіла і **галоўны ўрач Смалявіцкай цэнтральнай раённай бальніцы Святлана ДУБОЎСКАЯ,** якую мы папрасілі коратка пракаментаваць зварот заяўніка.

— Кожную сітуацыю трэба разглядаць індывідуальна. Так, рашэнне аб правядзенні аналізаў на платнай аснове можа быць прынята лечачым урачом — у інтарэсах чалавека. Але трэба ведаць, якое менавіта захворванне ў пацыента, як яно працякае, да таго ж, ці згодны сам кліент на платную працэдуру, — сказала Святлана Віктараўна. — Разам з тым, калі па клінічных паказчыках яна пацыенту патрэбная — будзе праведзена бясплатна.

Галоўны ўрач бальніцы была здзіўлена, што грамадзянін адрасаваў сваё пытанне найперш у газету. «Трэба было адразу звяртацца да адміністрацыі, можна было канкрэтна да мяне».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**
*rs@zviazda.by*

# СВЯДОМЫ ТАТА ПАЛЯПШАЕ ЗДАРОЎЕ МАМЫ

**Сетка «тата-школ» выходзіць за межы Мінска: чакаюцца заняткі ў Барысаве, актыўна прапагандаваць ідэі бацькоўства валанцёрам гатовыя ўрачы і псіхолагі ў Брэсце і Гродне. Гэта сведчанне таго, што шведска-беларускі праект, які рэалізуецца дабрачынным аб'яднаннем «Клуб ільвоў» сумесна з Мінскім гарадскім цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей і іншымі дзяржаўнымі структурамі, рухаецца ў правільным кірунку.**

— «Тата-чат», створаны як дадатковы сродак для запрашэння мужчын на заняткі ў «тата-школы»,ператварыўся ўжо ў амаль самастойны рэсурс для інтэрнэт-размоў на тэмы, якія хвалююць бацькоў. Ён налічвае ўжо больш за 200 удзельнікаў. Асобна плануецца рэалізоўваць праекты, якія ўвядуць татаў у тэмы адносін з падлеткамі, а таксама і дзецьмі, якія ўжываюць наркотыкі, — расказалі **Вячаслаў ШЧЭРБА і Раман КРУЧКОЎ, прадстаўнікі шведска-беларускага праекта з боку Беларусі.**

Каб яшчэ больш захацець мужчын задумацца пра сваё бацькоўства, на вуліцах павінны з'явіцца білборды, з якіх да татаў будуць звяртацца дзеці розных узростаў. Асноўная іх ідэя — «Што тваё дзіця будзе памятаць пра цябе». Акрамя таго, слухачы школы мараць зрабіць Дзень таты, што адзначаецца ў чэрвені, дзяржаўным святам.

— Хоць заняткі ў «тата-школах» і скіраваны на бацькоў, яны паляпшаюць здароўе жанчын, бо тыя адчуваюць сябе спакайнейшымі, ведаючы пра надзейны тыл, і менш стамляюцца ад работы, калі частку не бяруць на сябе мужчына, — адзначыў **Матс БЕРГГРЭН, кіраўнік шведска-беларускага праекта з боку Швецыі.** — Усё разам гэта працуе на дасягненне галоўнага выніку — выхаванне шчаслівага дзіцяці.

**Ірына СІДАРОК.**
*sidarok@zviazda.by*

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

## МУЖЧЫН ПРЫБАВІЛАСЯ

### За год іх у Беларусі стала больш на 6 тысяч

**Па звестках Белстата, на пачатак гэтага года мужчын налічвалася 4 мільёны 427 тысяч. Хоць у агульнай колькасці насельніцтва іх удзельная вага застаецца нязменнай — 46,6 працэнта.**

Большасць мужчын (75 працэнтаў) — гараджане. Кожны пяты — мінчанін. Сярэдні ўзрост беларускіх мужчын складае 37 гадоў. Прычым сярэднестатыстычны вясковец старэйшы за гараджаніна. 65 працэнтаў знаходзяцца ў працаздольным узросце, 16 працэнтаў — пенсіянеры. Сярод занятых у эканоміцы Беларусі мужчын — 49,3 працэнта. Традыцыйна мужчынскімі відамі дзейнасці застаюцца прамысловасць, будаўніцтва і транспарт. Летась 64,5 тысячы прадстаўнікоў моцнай паловы нашай краіны ўступілі ў шлюб, з іх 46,1 тысячы чалавек ажаніліся ўпершыню. Сем'і беларускія мужчыны ствараюць пераважна ў 20—29 гадоў.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

## РЭВАЛЬВЕР, ЗРОБЛЕНЫ Ў 1917 ГОДЗЕ,

**знайшоў 38-гадовы гамяльчанін, калі рабіў рамонт у хаце, дзе раней пражываў яго дзед.**



Мужчына прыйшоў у аператыўна-дзяжурную службу Добрушскага РАУС і прынёс зброю з просьбай знішчыць. Як расказаў **афіцыйны прадстаўнік УУС Гомельскага аблвыканкама Юрый ПІЛЬКЕВІЧ,** здзіўленню супрацоўнікаў дзяжурнай часткі не было мяжы, калі яны пабачылі «Наган» калібра 7,62 мм. Рарытэт, дарэчы, мае нумар — 988 і надпіс: «ТУЛЬСКИЙ ИМПЕР. ПЕТРА ВЕЛИК ОРУЖ. ЗАВОД 1917». Такім чынам, знойдзены рэвальвер выявіўся аднагодкам беларускай міліцыі. Праваахоўнікі кажуць, што зброя захавалася вельмі добра і цалкам спраўная. Цяпер па рэвальверы прызначана балістычная экспертыза. Між тым ва УУС нагадваюць, што грамадзяне, якія добраахвотна здалі зброю, боепрыпасы і выбуховыя рэчывы, вызваляюцца ад крымінальнай і адміністрацыйнай адказнасці.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

## ШКАРПЭТКІ Ў БЛЯШАНЦЫ

**Брэсцкі панчошны камбінат зрабіў такі падарунак-жарт да Дня абаронцаў Айчыны.**



Чарговую партыю мужчынскіх шкарпэтак закаталі ў кансервавыя бляшанкі. Маўляў, можна ўзяць з сабой на пікнік, і заўсёды будзе ў запасе пара сухіх шкарпэтак. Калі інфармацыя з'явілася ў сеціве, я, шчыра кажучы, не паверыла, падумала, розыгрыш. Патэлефанавала ў фірмавую краму прадпрыемства, якая знаходзіцца побач з камбінатам.

Там сказалі: праўда. Але тавару ў продажы няма, яго раскупілі за адзін дзень, было выпушчана толькі тры тысячы бляшанак. Што ж, як кажуць, з пачынам! Да жаночага дня будзем чакаць бікіні ў слоіках. Яшчэ больш забаўна.

## ЛЁД СТАЎ НЕБЯСПЕЧНЫМ

**Брэсцкі абласны савет таварыства выратавання на водах звярнуўся да насельніцтва з папярэджаннем аб небяспецы выхаду на лёд.**

У апошнія дні тэмпература паветра ў рэгіёне значна павысілася, часам слупок тэрмометра падымаецца да адзнакі плюс 10. У такой абстаноўцы лёд губляе трываласць, актыўна ўтвараюцца намывы і прамывіны. Таму нават знешне трывалае ледзяное покрыва можа таіць смяротную небяспеку. З пачатку гэтага года на вадзе загінула трое жыхароў рэгіёна, дваіх удалося выратаваць. Так, у Брэсце нецвярозы рыбак на Мухаўцы блізка падышоў да краю прамывіны і праваліўся ў ваду. Небараку выцягнулі з вады таварышы. Па-ранейшаму актуальнай застаецца праблема гібелі на вадзе людзей у стане алкагольнага ап'янення.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.** *yackevich@zviazda.by*

■ Будзь у курсе!

## Следства просіць зверыць нумары купюр

**Следчы камітэт просіць грамадзян дапамагчы ў знаходжанні падробленых купюр наміналам 20 рублёў з серыйным нумарам СК 8387976 узору 2009 года, паведаміў афіцыйны прадстаўнік УСК па Мінску Аляксей КЛІМОВІЧ.**

Фрунзенскі раённы аддзел Следчага камітэта распачаў крымінальную справу ў дачыненні да двух мужчын, якія падазраюцца ў вырабе і збыце падробленых беларускіх рублёў. Падставай паслужылі матэрыялы праверкі, праведзенай супрацоўнікамі УБЭЗ ГУУС Мінгарвыканкама. Падазраваныя затрыманы. Падчас папярэдняга расследавання следчымі сумесна з супрацоўнікамі міліцыі частка падробленых грашовых знакаў канфіскавана. Следства мяркуе, што ў грамадзянскім абароце могуць яшчэ знаходзіцца падробленыя купюры наміналам 20 рублёў узору 2009 года з серыйным нумарам СК 8387976. У сувязі з гэтым следства звяртаецца да грамадзян з просьбай зверыць нумары грашовых знакаў, якія знаходзяцца ў карыстанні. У выпадку супадзення серыйнага нумара неабходна звярнуцца па тэлефонах: 8 (017) 252 02 02, 8 (017) 256 14 34.

Падазраваныя 1991 і 1989 гадоў нараджэння са студзеня па люты выраблі з мэтай збыту каля 200 адзінак такіх грашовых знакаў. Падробленыя купюры збываліся ў арганізацыях гандлю, маршрутных таксі, кіёсках КУП «Мінсктранс» і іншых арганізацыях з мэтай размену, шляхам набыцця недарагіх тавараў.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■